## Praesens conjunctīvi actīvi/passīvi

Praesens conjunctīvi actīvi/passīvi (цяперашні час умоўнага ладу незалежнага/залежнага стану) утвараецца ад асновы infectum з дапамогай суфіксаў -ē-/-ā- і асабовых канчаткаў actīvi/passīvi (незалежнага/залежнага стану):

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Аснова infectum** | + | **-ē-**<br>**-ā-** | **(I спр.)**<br>**(II, III, IV спр.)** | + | **асабовыя канчаткі actīvi/passīvi** |

З а ў в а г і.
1. У 1 *sg*. у незалежным стане канчатак **-m**, у залежным — **-r**.
2. У I спражэнні **-ā** у канцы асновы выпадае ва ўсіх формах.

**Асабовыя канчаткі actīvi**

| Асоба | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| 1-я | **m** | **mus** |
| 2-я | **s** | **tis** |
| 3-я | **t** | **nt** |

**Асабовыя канчаткі passīvi**

| Асоба | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| 1-я | **r** | **mur** |
| 2-я | **ris** | **mĭni** |
| 3-я | **tur** | **ntur** |

**Узор спражэння. Actīvum**

| Асоба | laud-o, 1 (laudā-) *хваліць* | doce-o, 2 (docē-) *вучыць* | scrib-o, 3 (scrib-) *пісаць* | audi-o, 4 (audī-) *слухаць* |
|---|---|---|---|---|
| | Singulāris | | | |
| 1-я | laud-**e**-**m** | doce-**a**-**m** | scrib-**a**-**m** | audi-**a**-**m** |
| 2-я | laud-**e**-**s** | doce-**a**-**s** | scrib-**a**-**s** | audi-**a**-**s** |
| 3-я | laud-**e**-**t** | doce-**a**-**t** | scrib-**a**-**t** | audi-**a**-**t** |
| | Plurālis | | | |
| 1-я | laud-**ē**-**mus** | doce-**ā**-**mus** | scrib-**ā**-**mus** | audi-**ā**-**mus** |
| 2-я | laud-**ē**-**tis** | doce-**ā**-**tis** | scrib-**ā**-**tis** | audi-**ā**-**tis** |
| 3-я | laud-**e**-**nt** | doce-**a**-**nt** | scrib-**a**-**nt** | audi-**a**-**nt** |

**Passīvum**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Singulāris | | | |
| 1-я | laud-**e**-**r** | doce-**a**-**r** | scrib-**a**-**r** | audi-**a**-**r** |
| 2-я | laud-**ē**-**ris** | doce-**ā**-**ris** | scrib-**ā**-**ris** | audi-**ā**-**ris** |
| 3-я | laud-**ē**-**tur** | doce-**ā**-**tur** | scrib-**ā**-**tur** | audi-**ā**-**tur** |
| | Plurālis | | | |
| 1-я | laud-**ē**-**mur** | doce-**ā**-**mur** | scrib-**ā**-**mur** | audi-**ā**-**mur** |
| 2-я | laud-**e**-**mĭni** | doce-**a**-**mĭni** | scrib-**a**-**mĭni** | audi-**a**-**mĭni** |
| 3-я | laud-**e**-**ntur** | doce-**a**-**ntur** | scrib-**a**-**ntur** | audi-**a**-**ntur** |

З а ў в а г а. Формы 1 *sg*. praesens conjunctīvi дзеясловаў III, IV спражэнняў трэба адрозніваць ад форм 1 *sg*. futūrum I indicatīvi, якія таксама ўтвараюцца з дапамогай суфікса -**ā**-: scrib-**a**-**m**, audi-**a**-**m**.

**Praesens conjunctīvi**
**дзеяслова sum, fui, — , esse — *быць* і вытворных**

| Асоба | sum, esse *быць* | ab-sum, ab-esse *адсутнічаць* | pos-sum, posse *магчы* |
|---|---|---|---|
| | | Singulāris | |
| 1-я | sim | ab-sim | pos-sim |
| 2-я | sis | ab-sis | pos-sis |
| 3-я | sit | ab-sit | pos-sit |
| | | Plurālis | |
| 1-я | simus | ab-sīmus | pos-sīmus |
| 2-я | sitis | ab-sītis | pos-sītis |
| 3-я | sint | ab-sint | pos-sint |

## Imperfectum conjunctivi activi/passivi

Imperfectum conjunctīvi actīvi/passīvi (прошлы час незакончанага трывання ўмоўнага ладу незалежнага/залежнага стану) утвараецца ад асновы infectum з дапамогай суфіксаў **-rē-/-ĕrē-** і асабовых канчаткаў actīvi/passīvi (незалежнага/залежнага стану):

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Аснова infectum** | + | **-rē-**<br>**-ĕrē-** | **(I, II, IV спр.)**<br>**(III спр.)** | + | **асабовыя канчаткі actīvi/passīvi** |

З а ў в а г і.
1. У 1 *sg*. у незалежным стане канчатак **-m**, у залежным — **-r**.
2. У IIIб спражэнні **-ĭ** у канцы асновы выпадае ва ўсіх формах.

**Узор спражэння. Actīvum**

| Асоба | laud-o, 1 (laudā-) *хваліць* | doce-o, 2 (docē-) *вучыць* | scrib-o, 3 (scrib-) *пісаць* | faci-o, 3 (facĭ-) *рабіць* | audi-o, 4 (audī-) *слухаць* |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Singulāris | | |
| 1-я | laudā-**re-m** | docē-**re-m** | scrib-**ĕre-m** | fac-**ĕre-m** | audī-**re-m** |
| 2-я | laudā-**re-s** | docē-**re-s** | scrib-**ĕre-s** | fac-**ĕre-s** | audī-**re-s** |
| 3-я | laudā-**re-t** | docē-**re-t** | scrib-**ĕre-t** | fac-**ĕre-t** | audī-**re-t** |
| | | | Plurālis | | |
| 1-я | lauda-**rē-mus** | doce-**rē-mus** | scrib-**erē-mus** | fac-**erē-mus** | audi-**rē-mus** |
| 2-я | lauda-**rē-tis** | doce-**rē-tis** | scrib-**erē-tis** | fac-**erē-tis** | audi-**rē-tis** |
| 3-я | laudā-**re-nt** | docē-**re-nt** | scrib-**ĕre-nt** | fac-**ĕre-nt** | audī-**re-nt** |

**Passīvum**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | Singulāris | | |
| 1-я | laudā-**re-r** | docē-**re-r** | scrib-**ĕre-r** | fac-**ĕre-r** | audī-**re-r** |
| 2-я | lauda-**rē-ris** | doce-**rē-ris** | scrib-**erē-ris** | fac-**erē-ris** | audi-**rē-ris** |
| 3-я | lauda-**rē-tur** | doce-**rē-tur** | scrib-**erē-tur** | fac-**erē-tur** | audi-**rē-tur** |
| | | | Plurālis | | |
| 1-я | lauda-**rē-mur** | doce-**rē-mur** | scrib-**erē-mur** | fac-**erē-mur** | audi-**rē-mur** |
| 2-я | lauda-**rē-mĭni** | doce-**re-mĭni** | scrib-**ere-mĭni** | fac-**ere-mĭni** | audi-**re-mĭni** |
| 3-я | lauda-**re-ntur** | doce-**re-ntur** | scrib-**ere-ntur** | fac-**ere-ntur** | audi-**re-ntur** |

З а ў в а г а. Формы imperfectum conjunctīvi дзеясловаў III спражэння трэба адрозніваць ад формы infinitīvus praesentis actīvi, якая таксама ўтвараецца з дапамогай суфік-

са -**ĕre**: scrib-**ĕre**-**m** (прысутнічае асабовы канчатак), але scrib-**ĕre** (асабовы канчатак адсутнічае).

**Imperfectum conjunctīvi**
**дзеяслова sum, fui, —, esse — *быць* і вытворных**

| Асоба | sum, esse *быць* | ab-sum, ab-esse *адсутнічаць* | pos-sum, posse *магчы* |
|---|---|---|---|
| | Singulāris | | |
| 1-я | essem | ab-essem | possem |
| 2-я | esses | ab-esses | posses |
| 3-я | esset | ab-esset | posset |
| Plurālis | | | |
| 1-я | essēmus | ab-essēmus | possēmus |
| 2-я | essētis | ab-essētis | possētis |
| 3-я | essent | ab-essent | possent |

З а ў в а г а. Imperfectum conjunctīvi дзеяслова possum — *магчы* утвараецца няправільна.

## Кан'юнктыў у галоўным (незалежным) сказе

У галоўным (незалежным) сказе кан'юнктыў абазначае пажаданае або магчымае дзеянне.

### А. Кан'юнктыў волі і жадання

1. **Conjunctīvus adhortatīvus** (кан'юнктыў заклiку). Абазначае заклік. Ужываецца ў 1 *pl.* praesens conjunctīvi. Адмоўе *ne*. Перакладаецца з дапамогай слова *давайце*: Gaudeāmus! — *Давайце радавацца!*

2. **Conjuntīvus imperatīvus** (кан'юнктыў загаду). Абазначае настойлівае жаданне, загад. Ужываецца ў 2/3 *sg./pl.* praesens conjunctīvi. Перакладаецца умоўным ладам, загадным ладам (2-я асоба) або з дапамогай слоў *хай*, *няхай* (3-я асоба): Dicas! — *Кажы! Казаў бы ты!* Dicant! — *Няхай яны кажуць! Казалі б яны!*

3. **Conjunctīvus prohibitīvus** (кан'юнктыў забароны). Абазначае забарону. Заўсёды ўжываецца з часціцай *ne* — *не* ў 2 *sg./pl.* praesens/perfectum conjunctīvi (без адрознення ў трыванні). Перакладаецца ўмоўным або загадным ладам: Ne scribas! — *Не пішы! Не пісаў бы ты!*

4. **Conjunctīvus optatīvus** (кан'юнктыў жадання). Абазначае жаданне. Ужываецца: а) praesens conjunctīvi (жаданне безадносна яго здзяйсняльнасці); б) imperfectum conjunctīvi (жаданне, якое не можа быць здзейсніна ў цяперашнім); в) plusquamperfectum conjunctīvi (жаданне, якое не было здзейсніна ў мінулым). Адмоўе *ne*. Перакладаецца ўмоўным ладам, загадным ладам (2-я асаба), з дапамогай слоў *няхай*, *хай*; часта ўжываецца з часціцай *utĭnam* — *о калі б*: Sis felix! — *Быў бы ты счаслівы! Будзь счаслівы! Няхай ты будзеш шчаслівы!* (ты можаш быць счаслівы). Utĭnam esses felix! — *О калі б ты быў счаслівы!* (але зараз ты не счаслівы).

**Б. Кан'юнктыў неабходнасці і магчымасці**

1. **Conjunctīvus potentiālis** (кан’юнтыў магчымасці). Абазначае магчымасць. Ужываецца: а) praesens/perfectum conjunctīvi (дзеянне, магчымае ў будучым); б) imperfectum conjunctīvi (дзеянне, магчымае ў мінулым). Адмоўе *non*. Перакладаецца ўмоўным ладам і/або з дапамогай слоў *бадай, бадай што*, *мабыць, магчыма*, *можа быць*, *мог бы*: Dicas. — *Ты б сказаў. Ты*, *магчыма*, *скажаш. Ты мог бы сказаць* (у будучым). Dicĕret. — *Ён бы сказаў. Ён*, *магчыма*, *сказаў бы. Ён мог бы сказаць* (у мінулым).

2. **Conjunctīvus concessīvus** (кан’юнктыў уступкіуступкі). Абазначае ўступку, дапушчэнне. Ужываецца ў 3 *sg./pl.*: а) praesens conjunctīvi (дапушчэнне адносна цяперашняга); б) perfectum conjunctīvi (дапушчэнне адносна мінулага). Адмоўе *ne*. Перакладаецца з дапамогай слоў *няхай, хай*, *дапусцім*, *хоць*; часам ужываецца з часціцай *ut* — *нахай і*, *хоць і*: Amet. — *Дапусцім*, *ён кахае*. Ut amavĕrit. — *Няхай (пусць) ён і кахаў.*

3. **Conjunctīvus dubitatīvus** (кан’юнктыў сумнення). Выражае сумненне, роздум таго, хто гаворыць, над тым, што яму рабіць. Ужываецца ў пытальным сказе ў 1 *sg./pl.*: а) praesens conjunctīvi (адносна цяперашняга); б) imperfectum conjunctīvi (адносна прошлага). Адмоўе *non*. Перакладаецца інфінітывам з давальным склонам: Quid agam? — *Што мне рабіць?* Quid agĕrem? — *Што мне было рабіць?*